БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 9 (91)
сакавік
2009 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.

ГЕРМАНІЯ СЛУХАЕ БРЫЛІ

с.4-6

Фота Алеся Буракова

KAMUNIKAT.ORG

Улада с.2-3
Пераправа с.3
Свята с.6
Памяць с.8

Зробленае і планы

18 сакавіка 2009 года адбылася чарговая сесія Брылеўскага сельскага Савета. Галоўнае пытанне -- аб выніках працы ў 2008 годзе і планах на перспектыву.

Старшыня выканкама сельсавета Уладзімір Ільіча Мажораў у сваёй справаздачы падкрэсліў, што мінулы год быў спрыяльным для сельскай гаспадаркі. Зернавых намалацілі на 14,7% болей, чым планавалася. Ураджайнасць склала 49 ц\га у фірме "Днепр" і 43 ц\га у СПК "Макаранцы".

У.І.Мажораў

Працягваецца тэхнічнае пераўзбраенне гаспадарак, зменшылася доля ручной працы. У мэтах мадэрнізацыі машынна - трактарнага парка было набыта 32 адзінкі новай с \ х тэхнікі. У Макаранцах з'явіўся новы племянны статак. Павялічыліся надоі малака. Усё гэта станоўча адбілася на росце зарплат і забяспячэнні працай вяскоўцаў. Агульны прыбытак узрос на 10,5 %.

Свой узнёсак у агульную справу робяць і асабістыя гаспадаркі. Негледзячы на тое, што колькасць пагалоўя зменшылася на 10 адзінак (6 у Макаранцах і 4 у Брылях), збор малака павялічыўся: у Макаранцах сабралі 63 т пры плане 61,7 т, а у фірме "Днепр" 181 т пры плане 173 т. Гэта добра, бо гэтае пытанне заўсёды было складаным.

Са станоўчага боку паказалі сябе работнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Быў зроблены вадаправод у в. Машанакі, адрамантаваны два "мяккіх" дахі ў Брылях, зроблены рамонты ў пад'ездах дамоў.

Стан нашых дарог жадае быць лепшым. Зроблены дарогі ў Макаранцах па вул.Піянерскай, у Брылях ад вуліцы Першамайскай да вуліц Кастрычніцкай і Палявой і далей -- да Малееўскіх могілак. Запланавана зрабіць дарогі па вуліцах Маладзёжных у Брылях і Макаранцах. Складанасць гэтага пытання ў тым, што грошы ідуць праз упраўлення капітальнага будаўніцтва, а там прыярытэты скіраваны туды, дзе будуюцца аграгарадкі. Неабходна вызначыцца з мерамі ўздзеяння на ДРСУ-128, каб даглядаліся тыя дарогі, якія знаходзяцца на іх балансе.

Былі адрамантаваны 8 калодзежаў, зроблена агароджа вакол Малееўскіх могілак, адрамантавана агароджа ў Макаранцах. Трэба адзначыць працу дэпутата А. М. Яцковай, якая шмат намаганняў прыклала па пытаннях рамонту калодзежа на вуліцы Кастрычніцкай і дарогі ад вуліцы Першамайскай.

Станоўча развіваўся спажывецкі рынак. Гандлёвыя прадпрыемствы сельсавета даведзеныя планы выканалі. Але, па словах і саміх работнікаў, і старшыні райспажыўсаюза Т.М.Барлюговай, на бягучы год даведзеныя планы з'яўляюцца непасільнымі і невядома, як іх выконваць. Бо заробкі насельніцтва не павялічваюцца і попыт на тавары зменшыўся.

Бытавое абслугоўванне на тэрыторыі сельсавета практычна адсутнічае. У Брылях няма камплекснага прыёмнага пункта. У Макаранцах ён ёсць, але няма работніка, -- ён звольніўся з-за нізкага заробку. Ніхто з мясцовых жыхароў не хоча ісці туды працаваць , а аднекуль звонку нікога знайсці практычна немагчыма. У Брылях планавалася зрабіць пункт у памяшканні былой канторы калгаса, але на рамонт грошай не далі, і пытанне "завісла".

Установы адукацыі, культуры, аховы здароўя працуюць у межах сваёй кампетэнцыі. У сувязі з зыходам у дэкрэтны адпачынак А.У.Аляксейковай узнікла пытанне медыцынскага абслугоўвання жыхароў брылеўскага рэгіёну, але з дапамогай Сухарэўскай участковай бальніцы і раённага кіраўніцтва спадзяемся станоўча вырашыць гэтае пытанне.

Значную дапамогу выканкаму аказваюць нашы старшыні селькамаў. Гэтыя людзі заўсёды непакояцца аб тым, што адбываецца ў іх вёсках, імкнуцца вырашаць узнікаючыя праблемы. Мы ім удзячныя і спадзяемся на далейшае цеснае супрацоўніцтва.

Трэба адзначыць, што гэты год будзе даволі складаным і цяжкім. Ніхто не ведае як, што і куды павернецца. Фінансаў няма нават на аграгарадкі. Але трэба жыць, і мы будзем жыць далей, працуючы на роднай зямлі.

Намеснік старшыні сельсавета Таццяна Фёдараўна Смалякова адзначыла, што вырашаць нейкія гаспадарчыя пытанні пры адсутнасці фінансавання вельмі праблематычна. У Макаранцах, дзе яна жыве, хацелася б бачыць чыстыя вуліцы, абкошаные сядзібы, не забруджанае сметнікамі наваколле. У нейкіх выпадках пасля папярэджвання трэба наказваць і рублём, бо па-іншаму людзі не разумеюць. А дзеля гэтага трэба працаваць усім разам, далучаць сюды і ўчастковага міліцыянера, бо калі дэпутат у адзіночку на нешта непатрэбнае ўказвае, то ў адказ можа пачуць нават пагрозы.

Н.А.Нюнько і Т.Ф.Смалякова

Дэпутат Леанід Андрэевіч Баранаў выказаўся наконт таго, што трэба вырашыць пытанне з вывазам смецця з вуліцы Садовай у Брылях. Там людзям проста няма куды дзець адходы сваёй жыццядзейнасці, таму і пачынаюць выкідваць некуды за вугал, за кусцік, у канаву і г.д. Напрыклад, у Чаромушках гэтую патрэбную справу робіць трактар, які вывозіць гной: у нядзелю ці пасля асноўнай работы 1- 2 гадзіны працуе на вывазе смецця.

Л.А.Баранаў

Член выканкама Валянціна Васільеўна Ляутка падкрэсліла, што ў любой справе ёсць і поспехі, і недаробкі. Трэба больш увагі звяртаць на тое, у якіх умовах жывуць людзі. Вось шмат казалі пра тое, што трэба рабіць ёмістасці для вадкіх памыяў ля шматкватэрных жылых дамоў, але справа з месца не кранаецца. А гэты бруд кожны дзень цяче людзям на агароды.

В.В.Ляутка

Майстар участка ЖКГ Аляксандр Мікалаевіч Сілкоў звярнуў увагу на тое, што некаторыя брылеўскія кватэраздымшчыкі, якія працуюць ў фірме "Днепр", не плацяць за паслугі ЖКГ. Трэба неяк вырашаць гэтую вострую праблему.

А.М.Сілкоў

Намеснік генеральнага дырэктара фірмы "Днепр", дэпутат Алена Мікалаеўна Шляхтава адказала, што яны ведаюць гэту праблему і будуць пашыраць меры ўздзеяння на такіх работнікаў. Бо заробкі яны атрымліваюць і павінны ў вызначаныя тэрміны разлічвацца з усімі патрэбнымі плацяжамі.

А.М.Шляхтава

Сакратар выканкама сельсавета Надзея Іванаўна Рамашкевіч у працяг тэмы прапанавала стварыць адпаведную камісію з удзелам юрыстаў ЖКГ і ў тых рамках вырашаць гэтыя пытанні, -- нават і высяляць такіх неплацельшчыкаў з займаемых кватэр.

Н.І.Рамашкевіч

Старшыня селькама в. Брылі Тамара Васільеўна Максімчыкава засяродзіла ўвагу прысутных на тым, што жыхары практычна засталіся без штодзённай медыцынскай дапамогі. Пакуль не будзе работніка на замену і калі будуць прыязджаць медыкі з Сухарэй, то няхай вязуць з сабой аптэчку з неабходным мінімумам лекавых сродкаў -- каб можна было тыя таблеткі купіць.

Загадчык Брылеўскага ФАПа, дэпутат Алеся Ўладзіміраўна Аляксейкова адказала, што лекі -- гэта справа аптэкі № 96/10, і з тымі работнікамі трэба дамаўляцца. Што тычыцца медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, то існуюць пэўныя цяжкасці з кадрамі, -- нават у Сухарэўскай участковай бальніцы, дзе па штату павінны быць два ўрачы, працуе толькі адзін -- другога ніяк не могуць знайсці. Але ў Брылі абяцалі знайсці работніка на ФАП да мая.

А.У.Аляксейкова

Па абмеркаваным пытанні павесткі дня была прынята адпаведная пастанова. Работа выканкама сельсавета за справаздачны перыяд прызнана здавальняючай.

Далей была заслухана справаздача члена выканкама, дэпутата Яцковай Алы Міхайлаўны аб выкананні дэпутацкіх абавязкаў. Галоўнае тут, па словах А.М.Яцковай, -- быць заўсёды сувязным звяном паміж сваімі выбаршчыкамі і вышэйшымі ўладамі, па магчымасці дапамагаць людзям у вырашэнні ўзнікаючых пытанняў. Асноўнае з таго, што была зроблена агульнымі намаганнямі -- рамонт "дарогі жыцця" ад вуліцы Першамайскай і да Малееўскіх могілак. Але трэба за гэтай дарогай адпаведным чынам даглядаць, а таксама прывесці ў належны стан вуліцы Кастрычніцкую і Палявую. Таксама неабходна вырашыць праблему мясцовых сметнікаў, асабліва на вуліцы Палявой. Выбаршчыкі спадзяюцца на дэпутатаў, і мы павінны апраўдаць гэтыя спадзяванні.

А.М.Яцкова

Н.І.Рамашкевіч паведаміла, што з боку пакупнікоў брылеўскага магазіна раз-пораз узнікаюць прэтэнзіі з-за таго, што на некаторыя тавары, асабліва на хлебабулачныя вырабы, няма цэннікаў. Т.В.Максімчыкава звярнула ўвагу на тое, што ля магазіннага ганка па вясне, увосень і калі дажджлівае надвор'е узнікае вялікая лужына, і трэба тут зрабіць неабходныя рамонтныя работы.

М.А.Яцкоў агучыў просьбу ветэрана працы М. І. Старавыбарнай аб выпісцы ў фірме "Днепр" гною для апрацоўкі прысядзібнага ўчастка. Дэпутат А.Я.Крывулькін паведаміў, што гэта можна вырашыць, калі будуць вывозіць гной з фермы в. Качурына.

А.Я.Крывулькін

У сваім заключным слове У.І.Мажораў папрасіў дэпутатаў быць разам са сваімі выбаршчыкамі, больш зносіцца з імі, разважліва і зразумела тлумачыць людзям існуючыя жыццёвыя рэаліі.



Гэты здымак быў зроблены адразу пасля агучвання на сесіі інфармацыі пра магазінную лужыну. На самой справе -- проста так зайсці ў магазін даволі складана...



Германія слухае Брылі

Брылі даўно трапілі ў сферу германскіх інтарэсаў. Апошнія 12 гадоў нашу вёску связвае сталае сяброўства з заходнегерманскім горадам Фрэдэнам. Туды ездзілі адпачываць некалькі пакаленняў маленькіх брылеўцаў, і кожны год адтуль вязуць сюды падарункі. Усе гэтыя акалічнасці не могуць не цікавіць прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі. Таму і не было выпадковасцю з'яўленне 21 сакавіка ў Брылях карэспандэнта радыёстанцыі “Deutsche Welle” (“Нямецкая Хваля”) Алеся Буракова. Галоўнай мэтай ягонага рэпартажу было расказаць пра стасункі Брылёў з германскімі сябрамі і пра тое, якім адбіткам гэтае сяброўства паклалася на людзей. Карэспандэнт імкнуўся ахапіць шырокі спектр меркаванняў брылеўцаў -- ад уражанняў пяцікласніцы Дар'і Саўчынай да разважанняў настаўніцы Тамары Трафімаўны Жураўковай. Было зроблена шмат фотаздымкаў. Не ўсё ўвайшло ў канчатковы варыянт репартажу, але ў цэлым інфармацыйны малюнак атрымаўся даволі аб'ектыўным, добразычлівым, па-нямецку роўным і разважлівым.

Алесь Буракоў і Дар'я Саўчына

Цяжкі хлеб фотамадэлі...

З ласкавай згоды Алеся Буракова мы раздрукоўваем фанаграмму гэтай перадачы, аздабляючы тэкст фотаздымкамі аўтара.

БЕЛОРУССКАЯ ДЕРЕВНЯ С «НЕМЕЦКИМ УКЛОНОМ»

(Эфир 25 марта 2009 г.)

Для того, чтобы найти в Брылях человека, которому есть что рассказать о Германии, достаточно подойти к первому встречному», -- так об этой деревне говорят её соседи. Приезжие это высказывание воспринимают как милую шутку. Но, оказывается, утверждение следует воспринимать буквально. Это подтвердила школьница Даша Савчина - первый увиденный человек на улице.

Д.Савчина: «Я учусь в пятом классе. Мне десять лет. Была я в Италии, в Германии и Голландии. В Германии я жила в семье, мне понравилось быть в той стране, -- там что-то новое постоянно».

Девочка Даша является типичным представителем молодых брыльчан. Они не помнят – когда и зачем впервые приезжали немецкие друзья. Единственным человеком, способным рассказать об истоках уникального сотрудничества, оказался только переводчик Владимир Таборко.

В.Таборко: «В тысяча девятьсот девяносто четвёртом году инициатива из города Фредена «КАВ» («Katholische Arbeitnehmer-Beweguing») приехала в Могилёв в поисках

Пятиклассница Даша Савчина

партнёра по сотрудничеству в оздоровлении чернобыльских детей. Вначале они оздоравливали детей Гуслищанской базовой школы, которая была закрыта в 1996 году. И с 1997 года в Фреден ездили дети Брылевской базовой школы. Каждый год брали на оздоровление в полном составе класс».

За 11 лет в небольшой городок в земле Северная Рейн-Вестфалия только школьников съездило более сотни. При этом сама деревня насчитывает только 350 жителей. Таким образом, нет практически ни одной брылевской семьи, так или иначе не связанной с немецким городком.

По иронии судьбы, вторым человеком, встреченным в деревне, стал Николай Шибаков. Он первым «прорубал окно» в далёкий Фреден.

Николай Шибаков: «Из этой партии, когда мы начали отсюда, из деревни, ездить, я первым попал. Как ребёнку, мне на то время очень понравилось там. До сих пор есть впечатления такие – сравниваю жизнь там и жизнь здесь, как бы, у нас. Есть разница. По сравнению с нами они не так расточительны. Трудолюбивый народ».

Николай Шибаков был в числе первых

В 1997 году у немецких партнёров встал вопрос: на кого опереться в деревне? И тогда Владимир Таборко сразу же повёл всех к директору клуба Миколе Яцкову – личности неординарной. Он поэт и композитор, является автором «Гимна» города Могилёва. На глазах этого человека происходит практически всё.

Николай Яцков: «Я памятаю першы прыезд немцаў. Гэта было вельмі цікава, весела: мы ўзнялі ўсю сваю самадзейнасць, у нацыянальных касцюмах, выйшлі, заспявалі песні, танцавалі танец беларускі. І што самае цікавае: каля сталоўкі мы іх сустракалі, усе нашы людзі выстраіліся такім напалову карэ, бабулькі кругам стаялі, і я памятаю твары тых бабулек – яны памяталі немцаў тых, якія ў 1941 годзе прыходзілі. Сказалі ім, што немцы едуць, дык яны вось так глядзелі вельмі падазрона, з-пад ілба, і ні адной усмешкі не было на тварах".

В тот момент то поколение всё встречало молчанием. И всё-таки, несмотря на скепсис бабушек, двенадцать лет назад брылевские дети впервые отправились за границу

Николай Яцков: «Магчыма, тыя бабулькі крышку "адмяклі" , калі іх унукі пачалі ездзіць у тую Германію. Нашым дзецям гэта падабалася – яны прыязджалі, расказвалі, ураджанні, фотаздамкі... Яны такія задумлівыя прыязджаюць. Яны маленькія, гэтыя дзеці, яны, можна сказаць, у тую палітыку і не лезуць, і не думаюць – яны проста глядзяць. А потым прыязджаюць дадому і пачынаюць задаваць пытанні: "Чаму там не так як тут? Чаму там лепей чым у нас?"

Микола Яцков

Жизнь в деревне резко изменилась, когда в Германию начали приглашать взрослых. В Брылях появились первые иномарки, кстати, некоторые до сих пор с немецкой символикой. А на домах появились первые спутниковые антенны. При этом при близком знакомстве с немецкими друзьями родители выяснили, что их детям помогают далеко не магнаты

Один из домов в Брылях

Автомобиль на улице в Брылях

КАМУНІКАТ.org

Николай Яцков: "Я сам быў у Фрэдэне па запрашэнні Хайнца-Георга і Анеты Кентруп. І я бачыў гэтых людзей: звычайныя нямецкія людзі. Яны не багатыя. І мне здаецца, што тут не проста з-за таго, што падаткі паменей ці што іншае. Яны проста хочуць дапамагчы".

Посмотрев на жизнь в Германии и увидев во Фредене такие же житейские заботы, брылевцы изменили своё отношение к немецким гражданам. Если раньше они воспринимали помощь как нечто должное, то теперь сами готовы поделиться последним.

Николай Яцков: "Калі немцы прыязджаюць, то тут такія "дастарханы" накрываюцца! А госці потым доўга прыходзяць у сябе ад такой беларускай гасціннасці. І доўга потым напрыканцы дня збіраюць тых немцаў па Брылях, -- яны тут ходзяць, абняўшыся, спяваюць песні. Яны ведаюць, што тут будзе весела і любяць сюды ездзіць. Бо там, у Фрэдэне, як мне здаецца, яны практычна не могуць так "адарвацца", як тут".

Брыли кардинально отличаются от соседних деревень. Здесь местные жители чуть-чуть знают немецкий язык, безошибочно находят на карте немецкие города, знают столицы федеральных земель. Единственное, что немного омрачает жизнь этой уникальной деревни – это постоянные изменения в белорусском законодательстве. Из-за них, к сожалению, с 2007 года выезд брылевских детей в Германию стал проблематичным.

Радыёстанцыя "Deutsche Welle" мае свой сайт у Інтэрнэце. Там 25 сакавіка 2009 г. быў змешчаны друкаваны варыянт гэтай перадачы. "Шапку" гэтага пераказу можна ўбачыць у пачатку нашай публікацыі пад самой назвай "Германія слухае Брылі". Старонку сайту можна знайсці па адрасу:
http://www.dw-world.de/dw/article/0,,4126822,00.html
Вядомы рэсурс "Белорусский партизан" перадрукаваў гэту публікацыю і змясціў на старонцы:
http://www.belaruspartisan.org/bp-forte/?page=100&backPage=13&news=37071&newsPage=0
Жадаючыя азнаёміцца могуць звярнуцца па пазначаных адрасах.

Мікола ЯЦКОЎ.

Традыцыйныя ўгодкі

22 сакавіка 2009 г. напярэдадні 91-й гадавіны абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі прадстаўнікі грамадскасці Магілёва сабраліся, каб у традыцыйна святочнай абстаноўцы адзначыць гэтыя ўгодкі. Перад прысутнымі з прамовай выступіў старшыня Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Уладзіміравіч Астаповіч. Цікавы экскурс у гісторыю Магілёва часоў надання яму Магдэбургскага права зрабіў загадчык аддзела публікацыі дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, кандыдат гістарычных навук Зміцер Лявонцьевіч Яцкевіч. Свае песні спяваў вядомы беларускі бард Ігар Мухін. Сярод запрошаных былі добра вядомыя брылеўцам перакладчык Уладзімір Аляксандравіч Таборка і журналіст Генадзь Вітольдавіч Суднік. Цэнтрам неафіцыйнай часткі святкавання зрабіўся вялікі святочны торт, якім пачаставаліся ўсе прысутныя. ***М.Я.***

Уладзімір Таборка і Генадзь Суднік

Зміцер Яцкевіч

Ігар Мухін

Брылеўская бібліятэка інфармуе...

Планета-семья

№ 5, 2008

Паэтэса Таццяна РУДЭНКА спапануе чытачам сваю калыханку:

Колыбельная сыну.

Закатилось солнце-колобок.
Ночь пришла и звёзды зажигает.
Повернись, сыночек, на бочок,
Мама сказку на ночь почитает.
Вслед за сказкой песенку спою,
Даже гномик слушать её будет.
Он в ладошку мягкую твою
Положить подарок не забудет.
И тебе приснится царство фей,
И фонарь волшебный, и незнайка,
Приключенья диких лебедей.
И лисёнок рыженький, и зайка.
Ты увидишь в море паруса,
Трубочиста смелого на крыше...
Закрывай, сыночек мой. глаза!
Спят давно и кошечки, и мыши...

Народная газета

11.03.2009 г.

Жительницу Саудовской Аравии Хамису Савади обвиняют во встрече и разговорах со своим 24-летним племянником и его другом, которые принесли женщине буханку хлеба. Кроме телесного наказания вдове грозит 4 месяца тюрьмы и депортация из страны. Обвинения основывались на показаниях отца племянника -- он посчитал, что женщина поступает порочно и безнравственно.

Судопроизводство в Саудовской Аравии ведётся по законам шариата. К примеру, за употребление алкоголя или наркотиков наказывают 80 палочными ударами, а за супружескую измену забрасывают камнями. За кражу здесь отсекают руку. Только в 2007 году в королевстве было казнено почти 40 человек -- им отсекли мечом голову на городской площади.

В этом государстве женщинам не только запрещено появляться в обществе мужчин, которые не являются их близкими родственниками, но и нельзя водить автомобиль.

ЗВЯЗДА

11.03.2009 г.

КАБ НЕ НАКЛІКАЦЬ БЯДУ

З пакаленне ў пакаленне, ад дзедаў да ўнукаў перадаваліся правілы паводзінаў у сям'і, каб абараніць сябе і сваіх родных ад заўчаснай смерці, г.зн. "не наклікаць бяду".

- Катэгарычна забаранялася браць што-небудзь з магілы ці могілак -- гэта значыць прынесці ў хату новую бяду.
- Катэгарычна забаранялася ўвечары месці ў хаце падлогу -- гаварылі так: кагосьці роднага "вымятаеце". Акрамя гэтага забаранялася месці падлогу двума венікамі адначасова.
- Катэгарычна забаранялася месці падлогу 9 ліпеня, на Фядору. Народныя знахары папярэджвалі: наклікаеце на сваіх родных бяду.
- Забаранялі месці падлогу пры нябожчыку, казалі так: хутка "вынесеце" каго-небудзь яшчэ. Вымятаць і мыць падлогу дазвалялася толькі тады, калі працэсія з нябожчыкам пайшла на могілкі. І яшчэ -- выносіць смецце і выліваць брудную ваду дазвалялася толькі тады, калі людзі вернуцца з могілак.
- Забаранялася ў нядзелю ўзбіваць пярыну -- казалі так: "паклічаце ў хату смерць".
- Старыя людзі гаварылі: цяжарная жанчына не павінна быць хроснай маці і хрысціць дзіця, інакш хтосьці з гэтых двух немаўлят пойдзе з жыцця.
- Не раілі браць хроснымі бацькамі людзей з такімі ж імёнамі, як і ў бацькоў хрэсніка. У такім выпадку хросныя бацькі хутка "заменяць" родных.
- Пад страхам смерці забаранялася вырубаць дрэвы на могілках!!!
- Нават жартам, па недарэчнасці ці па асабістым неразуменні ніколі і нікому не жадайце смерці. Гэты праклён можа павярнуцца супраць вас!

Аргументы и факты

№ 15, 2009 г.

ВОДА ВОЖДЕЙ

Над проблемами долголетия бьются учёные во всём мире. У профессора Геннадия Бердышева свой взгляд на проблему:

-- Мне и моим коллегам удалось отыскать немало доказательств в пользу продления жизни. Но какого-то единственного рецепта не существует. В Якутии и Ненецком округе пьют талую воду. На Кавказе и Алтае дышат разреженным воздухом. В Индии сдабривают чай... мрамором, содержащим 73 микроэлемента. Уверен, если бы вместо водопроводной воды мы могли пить воду, взятую с глубины 100 метров во льдах Антарктики, наша жизнь стала бы в полтора раза дольше. Этому есть реальное подтверждение. Когда в конце 70-х здоровье Леонида Ильича Брежнева резко ухудшилось, к этому моему совету прислушались -- растапливали антарктические керны, взятые со стометровой глубины, этой водой отпаивали генсека и только на ней готовили для него еду. Так удалось на несколько лет продлить жизнь руководителя страны.

Этот напиток я готовлю себе сам. Замораживаю в холодильнике обычную профильтрованную воду, потом вынимаю и ставлю на оттаивание. Когда в банке остаётся кусочек льда размером с яйцо, выкидываю его: этот лёд аккумулирует в себе все грязные, в том числе радиоактивные, примеси, которые разрушают клетки организма. Такие заморозки-разморозки воды делаю трижды, всякий раз вместе с куском льда выбрасывая «тяжёлую» воду. Остаётся «лёгкая» вода, полезней которой на земле нет.

Прозвішча падпісчыка

Міхаіл Емельянавіч НОВІКАЎ (1925-2009)

18 сакавіка 2009 года на 84-м годзе жыцця памёр Міхаіл Емельянавіч Новікаў.

Ён нарадзіўся 13 жніўня 1925 года ў вёсцы Шапчыцы Мастоцкага сельсавета ў сям'і Емельяна Васільевіча і Хрысціны Ільінічны Новікавых і быў першынцам. І з самога маленства, зведаўшы подых сялянскага побыту, быў добрым памочнікам бацькам і заўсёды адчуваў адказнасць за малодшых трох сясцёр і брата.

У 15-годовым узросце ён сустрэў вайну. Разам з іншымі вясковымі падлеткамі збіраў боеприпасы і зброю, каб перадаць партызанам. У кастрычніку 1943 года трапіў у адзін з магілёўскіх канцлагераў, а затым быў адпраўлены на работы ў Германію. Быў вызвалены ў красавіку 1945 г. Працаваў у Калінінградзе, потым у Маскве на ваенным заводзе і механікам аўтабазы Ўрада СССР.

Пасля службы ў Савецкай Арміі вярнуўся ў родныя Шапчыцы, а з 1951 года пачаў працаваць ў калгасе імя Ільіча.

У верасні 1954 года абраў шлюб з Кацярынай Ягораўнай Рамашкевіч, з якой пайшоў разам праз доўгія гады. На жаль, дзетак у іх не было, і гэта заўсёды клалася смуткам на жыццё.

Калі Кацярына Ягораўна адышла ў нябыт, праз пэўны час у жыццё Міхаіла Емельянавіча ўвайшла Соф'я Антонаўна, якая больш чым на дзесяць гадоў стала апорай іх сямейнага ладу.

Нягоды лёсу паклалі пэўны адбітак на характар Міхаіла Емельянавіча і на яго адносіны да жыцця, але ён заўсёды імкнуўся быць адкрытым, шчырым і дабрасумленным і на працы, і ў сялянскім асяродку.

Жыццё прайшло, і памяць засталася.

Бывай, Міхаіл Емельянавіч!..

АДНАВЯСКОЎЦЫ.

З успамінаў Міхаіла Емельянавіча НОВІКАВА:

« 28 октября 1943 года д.Шапчицы окружили немецкие автоматчики. Заходя в каждый дом, они выгоняли всех живущих там на улицу. На улице отобрали малодых и здоровых и согнали в один дом. Я оказался среди согнанных. Плач и вой стояли на деревне. Матери сходили с ума от горя. Приставив к каждому немца, нас водили по домам взять одежду и кое-какую еду. К вечеру нас погнали в д.Агеевка. Там в одном доме собрали всех согнанных из окрестных деревень молодых людей. Я оказался среди них. Наутро подогнали машины, погрузили нас и повезли в г.Могилёв. Там выгрузили в здании по ул.Ленинской. На следующее утро погнали рыть окопы на ул.Подгорную. Целую неделю рыли землю от темна до темна. Кормили один раз в день похлёбкой из капусты и свёклы.

Однажды утром подогнали крытые машины задом к тюрьме, погрузили людей и повезли на станцию. Перегрузили в вагоны-«телятники» и повезли на запад. Сначала до г.Барановичи, а затем через Польшу до Кенигсберга. За всю дорогу два раза поили водой. Затем был город Эрфурт и концлагерь. Истощённых за дорогу людей загнали в лагерные бараки. А через неделю меня привели на биржу, где отбирали на работу. Меня отобрали для работы чернорабочим в фирму «Штин Фугрант». Приходилось собирать мусор по городу и свозить на свалку. Очень хотелось есть. Иногда в куче мусора находили куски хлеба.

От постоянного недоедания и тяжёлой работы молодой организм не выдержал, и я заболел тифом. Немцы очень боялись этой болезни, поэтому заболевших не лечили, а отправляли в крематорий концлагеря Бухенвальд, который находился в девяти километрах от Эрфурта. Страшный запах из этого лагеря смерти доходил и до нас.

Меня определил в госпиталь отец хозяина фирмы. Это был старый уже немец. В госпитале меня пытались лечить. А когда я потерял сознание, меня выбросили вместе с умершими в морг. Забросали мёртвыми телами. Когда я очнулся, ужас охватил меня. Я начал кричать. Меня услышали. Вытащили и положили на кровать только что умершего русского. Таким образом я остался жить.

В апреле 1945 года стал слышен грохот орудий. 17 апреля в город вошли американские войска. Освободили невольников. Русские были переданы советскому командованию. До 28 июня я находился в фильтрационном лагере г.Мюльбера. Затем был отправлен на родину. Возвратился домой. Мать уже не надеялась видеть живым. Отец вернулся с фронта весь израненный и вскоре умер.

В 1949 году меня призвали в Красную Армию. С 1951 года живу в деревне Брыли. 35 лет проработал в колхозе им. Ильича».

Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь для жыхароў Брылеўскага рэгіёна і наваколля.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 100 асобнікаў.

Адрас для карэспандэнцыі:
213107 Магілёўскі раён п/а Брылі
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com
© "Брылеўскі летапіс", 2009

Заснавальнік і рэдактар
Мікола ЯЦКОЎ